# БІБЛІЯТЭКА ДЛЯ ЎСІХ



***"Якая бібліятэка ў Беларусі самая вялікая і найбольш аўтарытэтная?***

А.ШАХОВІЧ, Светлагорск".



Нацыянальная бібліятэка Беларусі — буйнейшая навуковая бібліятэка Рэспублікі Беларусь.

Універсальны фонд бібліятэкі унікальны па сваім складзе і налічвае звыш 7 млн. адзінак захоўвання (у тым ліку кніг, перыядычных выданняў, аўтарэфератаў, нот, гуказапісаў, выяўленчых выданняў, дыяматэрыялаў). Асаблівую каштоўнасць уяўляюць паўмільённы фонд нацыянальных выданняў і беларусікі, 50-тысячны фонд старадрукаваных і рэдкіх кніг. Нацыянальная бібліятэка мае звыш мільёна замежных выданняў, з'яўляецца дэпазітарыем матэрыялаў ААН і ЮНЕСКО.

Звыш 37 тысяч чытачоў штогод карыстаюцца паслугамі 13 галіновых і спецыялізаваных чытальных залаў. Агульная выдача — больш за 3 млн. асобнікаў у год.

Усебаковае раскрыццё фондаў бібліятэкі забяспечвае даведачна-пошукавы апарат, які ўключае каталогі, картатэкі, фонд даведачных і бібліяграфічных дапаможнікаў, архіў выкананых даведак.

***Тэлефон агенцтва***

***"ФРАНЦ-ПРЭС": 32-13-04.***